Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2014**

**Мерапрыемствы у рамках абласнога месячніка папулярызацыі мастацкай літаратуры «Маіх радкоў няма без Беларусі»**

**6 лістапада**

Гадзіна краязнаўства "Чытаем, ведаем, ганарымся". Да мерапрыемства падрыхтавалі мультымедыйную прэзентацыю і кніжна-ілюстрацыйную выставу "У родным слове – цэлы свет". Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з раздзелам краязнаўства на сайце Кобрынскай ЦБС.

*Дзівінская дзіцячая бібліятэка, 36 чал.*

**9 лістапада**

Пасяджэнне аматарскага клуба "Сонейка". Пазнавальна-гульнёвая праграма "За природу все в ответе – и взрослые, и дети". Праграма складалася з некалькіх тураў: "Каб чыстым быў наш дом!", "Гартаючы Чырвоную Кнігу", "Знаўцы прыроды". Дзеці прыводзілі ў парадак тэрыторыю вакол бібліятэкі, успомнілі расліны і жывёл, якія маюць патрэбу ў ахове. На пытанне "А што ж мы можам зрабіць для захавання роднай прыроды?" адказалі ў апытальніку "Я прыроду зберагу!". Лепшыя чытачы атрымалі ўзнагароды.

*Арэхаўская СБ, 15чал.*

**12 лістапада**

Гадзіна краязнаўства "Вандроўка па роднаму краю". Да мерапрыемства падрыхтавана выстава "Спадчына наша". З этнаграфічнага пакоя СДК былі прадстаўлены рэчы побыту беларусаў. Прысутныя прынялі актыўны ўдзел у віктарыне "Мой край", успомнілі беларускія прымаўкі і прыказкі.

*Лелікаўская СБ, 17 чал.*

**14 лістапада**

Дзень літаратурнага краязнаўства "Паэзія вайны святая". Мерапрыемства адбылося ў чытальнай зале бібліятэкі. Удзельнікамі мерапрыемства былі навучэнцы Кобрынскага політэхнічнага каледжа. Арганізатары падрыхтавалі відэапрэзентацыю "Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці паэтаў Кобрыншчыны", інфармацыйны агляд "Роля паэтычнага жанру ў гады ВАВ". Гучалі вершы пра вайну паэтаў В. І. Літошык, Ю. В. Харэвіча, В. С. Клачковіч. Паэт-бард Юрый Харэвіч выканаў свае песні ваеннай тэматыкі.

*Цэнтральная бібліятэка, 70 чал.*

**16 лістапада**

Фальклорная вечарына “Народныя святы зямлі беларускай”.Удзельнікі мерапрыемства разам з бібліятэкарам успомнілі аб святкаванні народных свят Беларусі: Купалле, Ражство Хрыстова, Пасха, Масленіца і інш. Дзеці даведаліся ў якія гульні гулялі нашыя продкі. З захапленнем гледачы прынялі ўдзел у віктарыне "Святы пакаленняў", а таксама адгадвалі загадкі і спявалі песні. Самыя актыўныя былі ўзнагароджаны памятнымі прызамі.

*Плянтаўская СБ, 26 чал.*

**20 лістапада**

Літаратурная гадзіна “Край блакітных азёраў”. Дзеці пазнаёміліся з творчасцю беларускіх пісьменнікаў і паэтаў “Хвілінка аб беларускай кніжцы”, адгадалі загадкі і чыталі вершы пра родную зямлю, яе працавітых людзей В. Віткі, І. Муравейка, А. Вольскага.

*Балоцкая СБ, 12 чал.*

**26 лістапада**

Краязнаўчыя чытанні “Личность А. М. Мартынова в истории Кобрина”. Галоўны бібліёграф цэнтральнай бібліятэкі прыняла ўдзел у раённых краязнаўчых педагагічных чытаннях, прысвечаных 110-годдзю з дня нараджэння А.М. Мартынава.

Мерапрыемства адбылося ў СШ №1 г.Кобрына. У чытаннях удзельнічалі супрацоўнікі турыстычна-краязнаўчага аддзела РЦДТ, ваенна-гістарычнага музея імя А.В. Суворава, дырэктар, настаўнікі гісторыі і вучні навукова-даследчай групы СШ №1. Галоўны бібліёграф ЦБ у сваім выступленні расказала аб А.М. Мартынаве, які быў першым загадчыкам Кобрынскай цэнтральнай бібліятэкі.

*Центральная бібліятэка, 37чал.*

## Іншыя мерапрыемствы

**12 лістапада**

Гадзіна міласэрнасці “Краски жизни через книгу”. Мерапрыемства прысвечана людзям, якія пражываюць у псіханеўралагічным інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў. У чытальным зале падрыхтавалі літаратурны агляд “Интересно, увлекательно, загадочно”, які суправаджаўся відэапрэзентацыяй. Прысутныя пагутарылі з паэтамі народнага аматарскага літаратурнага аб'яднання “Белы бусел” Лазюк Л. І. і Літошык В. І. Удзельнікі сустрэчы чыталі сваі лепшыя вершы. Усе запрошаныя атрымалі ў падарунак кнігі.

*Центральная бібліятэка, 38 чал.*

**20 лістапада**

Выступленне ЛПГ, прысвечанае Дню прафілактыкі СНІД “Сгорая плачут свечи”. Прысутным прапанаваны агляд літаратуры па здароваму ладу жыцця “Предупрежден – значит вооружен”. Удзельнікамі праінсцэніраваны розныя жыццёвыя сітуацыі, затым дана ацэнка кожнаму герою.

**21 лістапада**

Пасяджэнне аматарскага клуба “Светач”. Літаратурная гадзіна “Прамяністае святло таленту” да 115-годдзя з дня нараджэння М. Лынькова. Прысутныя пазнаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам Міхася Лынькова. Вучні з цікавасцю вялі гутарку пра аповесці пісьменніка і адказвалі на пытанні віктарыны. Самыя актыўныя былі ўзнагароджаны прызамі.

*Дзіцячая бібліятэка, 19 чал.*

**27 лістапада**

У цэнтральнай бібліятэцы прайшоў праблемны урок “Погасшие звезды” да Дня прафілактыкі ВІЧ і СНІД для вучняў старэйшых класаў. Афармлена выстава кніг “Урок во имя жизни”. Для ўсіх прысутных прадстаўлена відэапрэзентацыя “Чтобы жизнь продолжалась и завтра”. Вучні паслухалі выступленне опер-упаўнаважанага наркакантролю і супрацьдзеяння гандлю людзьмі Кобрынскага ГРАУС Салея М. Ю.

*Цэнтральная бібліятэка, 55 чал.*

Выканаўца:
метадыст АБМ
Кузьмінчук Ю. В.
Тел. 23681